

**Рачэўскі Станіслаў Рыгоравіч (S. G. Rachewski)**, кандидат филологических наук, доцент кафедры профессионального развития работников образования ГУО «Брестский областной институт развития образования» *(Брэст, Рэспубліка Беларусь) (Brest, Republic of Belarus)*; kafedra.boiro@yandex.ru

УДК 821. 161. 3

# ЦЮТЧАЎСКАЕ «ПРЫРОДА – НЕ ЗЛЕПАК, НЕ БЯЗДУШНЫ ЛІК…» У ПАЭЗІІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Анатацыя.** У артыкуле раскрываецца ўклад паэта Максіма Багдановіча ў развіццё прыродаапісальнай лірыкі.
**Ключавыя словы:** паэт, аўтар, верш, прырода, вечар, ноч, цішыня.

# TYUTCHEVSKOE « NATURE IS NOT A CAST, NOT A SOULLESS ACCOUNT... « IN THE POETRY OF MAXIM BOGDANOVICH

**Annotation.** The article reveals the contribution of the poet Maxim Bogdanovich to the development of nature-descriptive lyrics.
**Keywords:** poet, author, poem, nature, evening, night, silence.

Вядомыя радкі Ф. І. Цютчава аб прыродзе ў загалоўку артыкула – з іх набытай у стагоддзях крылатасцю «В ней есть душа, в ней есть

свобода, в ней есть любовь, в ней есть язык…» – на першы погляд, не маюць ніякіх адносін да паэтычнай творчасці заўчасна страчанага Беларуссю Максіма Багдановіча і яго адзінага прыжыццёвага зборніка «Вянок» (Вільня, 1913). Калі ж дапусціць, што такія адносіны ёсць, то, падкрэслім, – толькі як пэўны водгук маладога паэта (вершы зборніка пісаліся ў яго 17–20 год) на тое, як Цютчаў чытаў адвечную «кнігу прыроды», толькі як пэўная сугучнасць Багдановічавых вершаў з тым, што пакінуў чытачу рускі паэт, урэшце – як сітуацыя, калі «словесность одного языка имеет влияние на словесность другого» [1, с. 96].

Мусім заўважыць як верагоднае, што хваля паэтызацыі Цютчавым магутнай і ўзвышанай сілы прыроды магла дайсці да творчай свядомасці беларускага паэта спачатку на рускай глебе: пасля страты жонкі Марыі Апанасаўны Адам Ягоравіч Багдановіч, вядомы этнограф, фальклярыст, мовавед і педагог, пераехаў з дзецьмі з Гродна ў Ніжні Ноўгарад, а затым у Яраслаўль, дзе ў гімназіях юны Максім засвойваў каштоўнасці рускай класічнай літаратуры (пры тым, што пачынаў сваё вершаскладанне па-беларуску) і дзе бацька праз уласную рэдкую бібліятэку далучаў як да дарагой яму беларушчыны, так і да антычнай (Гарацый, Авідзій), заходнееўрапейскай (Верлен, Бадлер) і рускай літаратурных традыцый. На старонках многіх даследаванняў пра жыццё і творчасць Багдановіча часта сустракаецца – поруч з А. С. Пушкіным і А. А. Фетам – імя Ф. І. Цютчава. Да таго ж на пачатку ХХ стагоддзя пра падзабытага рускай інтэлігенцыяй Цютчава і філасофскі змест яго лірыкі, запатрабаваны на пераломе эпох, зноў загаварыла літаратурная крытыка, і на гэты час якраз і прыйшоўся кароткі творчы век Максіма. Быць не можа, такім чынам, каб душа маладога Багдановіча, прагная да эстэтычна каштоўнага, не ўлавіла ў паэтычнай спадчыне Цютчава яго памкнення апаэтызаваць у прыродзе і чалавеку ўсеадзінства быцця на зямлі. Вартая ўвагі думка даследчыка нашай нацыянальнай літаратуры Ул. Конана: адзначаючы «уплывы» Пушкіна, Цютчава, Фета на творчасць Багдановіча, ён падкрэслівае, што вопыт іншых быў паэту карысны «хіба што ў сэнсе нейкага «штуршка» для ўласнага паэтычнага ўзрушэння» [2, с. 124].

З пэўнасцю адзначым: тэма прыроды ў зборніку «Вянок» – скразная. Як і ў непасрэдных пейзажных замалёўках («Возера», «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…», «Зімой», «Па-над белым

пухам вішняў…», «Вечар», «Добрай ночы, зара-зараніца!», «Рандо», «Напілося сонца са крыніц сцюдзёных…», «Завіруха», «Санет (На цёмнай гладзі сонных луж балота…)», «Дзед», «Споўненае абяцанне», «Варажба»), прырода ў Багдановіча – неабходны фон, на якім паэту найлепш разважаецца, на якім выспявае яго грамадзянская думка, расце неспакой за Радзіму *(Краю мой родны! Як выкляты богам – / Столькі ты зносіш нядолі. / Хмары, балоты… Над збожжам убогім / Вецер гуляе на волі. / Поруч раскідаліcь родныя вёскі, / Жалем сціскаюцца грудзі! / Бедныя хаткі, таполі, бярозкі, / Усюды панурыя людзі; Дождж у полі і холад… Імгла… / Дзесь у вёсцы міргаюць агні. / Там, злякаўшысь, схавалась, лягла/ Доля горкая ў чорным цяні)*.

Беларуская прырода – рэальнасць, што патрэбна Багдановічу-паэту, каб праўдзівей адлюстраваць разнастайныя праявы жыцця і працы (у вершы «Слуцкія ткачыхі»: *А за акном смяецца поле, / Зіяе неба з-за акна, / І думкі мкнуцца мімаволі / Туды, дзе расцвіла вясна, / Дзе блішча збожжа ў яснпай далі, / Сінеюць міла васількі…*; у вершы «Перапісчык»: *Парой ён спыніцца, каб лепей завастрыць / Пяро гусінае, і гляне: светла сонца / Стаўпамі падае праз вузкае аконца, / І круціцца ў іх прыгожы, лёгкі пыл; / Як сіняваты дым нявідзімых кадзіл*).

Жаданне замалёўваць прыроду, пейзажыць паэтычным словам не пакідае Багдановіча і ў гарадскім асяроддзі *(За дахам места памеркла нябёс пазалота; / Паветра напоена ціха гусцеючым мрокам; / Ужо відна, як іскры злятаюць з трамвайнага дрота, / Як зоркі гараць і зрываюцца ў небе далёкам)*, і ў падарожжы да мясцін пражытага кахання *(Ізноў пабачыў я сялібы, / Дзе леты першыя прайшлі: / Там сцены мохам параслі, / Вясёлкай адлівалі шыбы. / Усё ў пылу. І стала мне/ Так сумна, сумна ў цішыне./ Я ў сад пайшоў. Усё глуха, дзіка, / Усё травою зарасло./ Няма таго, што раньш было,/ / І толькі надпіс «Вераніка», / На ліпе ўрэзаны ў кары, / Казаў вачам аб тэй пары)*.

Без замалёвак з прыроднай натуры Багдановіч не абыходзіцца, стวараючы міфалагічна-фантастычныя вобразы бога Падвея, лясуна, русалак *(Пляша, скача. Снег зрываецца, ляціць, / Веюць ў полі снегавыя рукава, / А Падвей нясецца, кружыцца, гудзіць, / Запявае, удалая галава!; Чуеш гул? – Гэта сумны, маркотны лясун / Пачынае няголасна граць: / Пад рукамі яго, навяваючы сум, / Быццам тысячы*

*крэпка нацягнутых струн,/ Танкаствольныя сосны звіняць)*. Тэхнічны прагрэс робіць сваё, ландшафт пачынае змяняцца, і на гэта паэт адгукаецца радкамі: *Праз радасны заліты светам бор / Праходзіць насып жоўтая чыгункі. / Як роўна рэйкі, быццам на малюнкі, / Ляглі ўдоўж! Як ярка семафор / Удалі зялёным шклом гарыць ад сонца!)*; а тым часам на Бацькаўшчыне і ў свеце – перасячэнне прыроды межамі і платамі ўласнасці *(Глядзі, па ўсёй зямлі святой / Шырокай хваляй залатой / Без краю блішча збожжа мора, / Цвітуць лугі, шумяць лясы… / Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы, / А людзі нішчацца у голадзе, у зморы / Ад беднаты, ад цемнаты, / Бо скрозь мяжы, бо скрозь – платы)*.

У літаратурнай крытыцы ёсць думка пра Ф. І. Цютчава, выказаная А. Тархавым: прырода для гэтага паэта не проста пейзаж, але прадмет і матэрыял яго паэтычнага мыслення [3, с. 7]. На наш погляд, такую ацэнку, і гэта пацвярджаецца прыведзенымі падборкамі прыкладаў, можна выказаць і пра творчую спадчыну Багдановіча ў яго «Вянку». Той жа А. Тархаў аргументавана паказвае: цютчаўская прыродаапісальная паэзія перапоўнена разнастайнымі вобразамі *вады*, увагай да жыцця вады ў прыродзе ва ўсіх яе формах, да вады як найважнейшай светастваральнай сілы; вада дае Цютчаву-«вадапаклонніку» правобразы для выражэння значнай палітры сэнсаў [3, с. 8]. Гэтае, пацверджанае многімі тэкстамі, адкрыццё матывуе да яго экстрапаляцыі ў рэчышча вершаў Максіма Багдановіча. У беларускага паэта расшыфроўцы паддаецца іншы сімвал: ім з'яўляецца *вечар*, *набліжэнне ночы*. Менавіта завяршэннем дня выражаны і назвы, і зачыны, і асноўныя тэмы і падтэмы многіх вершаў, напісаных у апошняе ў жыцці Максіма дзесяцігоддзе, як у групе наступных прыкладаў: *Вечар ціхі, вечар просты…* (1910); *Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…* (1910) *Чарнеецца сажаю вечар, / Дождж б'ецца аб хвалі ракі* (1909). *Месяц выплыў над змрочнай, заснуўшай зямлёй* (1909–1912); *Добрай ночы, зара-зараніца! / Ужо імгла над зямлёю лажыцца, / Чорнай рызаю ўсё пакрывае…* (1911); *Ціхі вечар; зьнікнула спякота…* (1912); *Хіліцца к вечару дзень, / І даўжэйшымі робяцца цені* (1910–1912); *Вось і ноч. Нада мной / Заліліся слязамі нябёсы* (1910); *Паветра напоена ціхім гусцеючым змрокам* (1912); *На глухіх вулках – ноч глухая / Не менш глухі людскі натоўп* (1911–1912); *Непагодны вечар. Сумна, дружа, мусі?..* (1915–1916); *Набягае*

*яно / Вечарамі, начамі, / Адчыняе акно / І шмарэе кустамі* (1917). Вечаровы зачын – і ў шэрагу філасофскіх і інтымных вершаў нашага класіка: *Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы / У ціхую сінюю ноч…* (1912–1915); *Халодная, ясная ноч… / Звонка хрушчыць сняжком, / Ідучы мне насустрач, дзяўчына…* (1912); *Зорка Венера ўзышла над зямлёю, / Светлыя згадкі з сабой прывяла…* (1909–1912).

У пошуку адказу на пытанне, чаму вечаровая пара так імпанавала паэту і стала такім важкім элементам яго мастацкай сістэмы з сімвалісцкай эстэтыкай, можна разглядаць наступную версію: магчыма, што менавіта вечар (калі ўсё ў наваколлі заціхае, усталёўваецца на адпачынак, калі нябёсы набіраюць пры заходзе сонца кожны раз непаўторны, прыязны каларыт і пачынаюць мігцець першыя зоркі, настройваючы свядомасць на рамантычны лад) дарыў мастаку камфортную зону для паэтычнай самарэалізацыі, натхняў, дапамагаў акрэсліць размытыя ўдзень вобразы, карціны, дэталі. У імкненні апаэтызаваць надыход ночы творчая душа Багдановіча пераклікаецца з Цютчавым, якога называлі “паэтам ночы”, што ўславіў таямнічы хаос цемры [4, с. 26], але ў беларускага паэта іншая матываванасць вечаровай тэмы і набліжэння ночы. Яго матыў, лічым, можна яшчэ шукаць і ў трагічных абставінах жыцця і творчасці: пасля смерці маці ад сухотаў Багдановіч ад гэтай і іншых хвароб страціў за кароткае жыццё шмат родных, асабліва балюча яму было ад адыходу ў нябыт 18-гадовага брата Вадзіма. Да таго ж і сам з 1909 года стаў туберкулёзным хворым, перажыў драму канчатковага дыягназу, апошнімі гадамі тварыў, задыхаючыся ад кашлю, велізарным намаганнем волі, перамагаючы слабасць; урэшце хвароба адняла і мову; трывожныя ж сімптомы праявіліся рана; пастаянна некалькі год жыў з высокай тэмпературай. Трэба меркаваць, што ўсвядомлены паэтам хуткі адыход з жыцця зямнога, безабароннасць перад тым, што не паддалося лячэнню, колькі б грошай не сабралі сябры на аздараўленне ў Ялце *(Даўно ўжо целам я хварэю, / І хвор душой…; Я, бальны, бескрыдлаты паэт! / Мо жыцця майго верш ужо спет…; Паломаны жыццём, чакаючы магілы, / Радзімая зямля, прынікнуў я к табе…)* асабліва стасаваліся са з’явай завяршэння дня, заходу сонца, немінучым наступленнем цемры. Хоць, праўду кажучы, нуда і трывога даравітага літаратара часта перабіваецца ў «Вянку» бадзёрым настроем, надзеяй выжыць і яшчэ многае зрабіць: *Шмат зазнаў я*

*горычы з нудою, / Што шчаміла, мучыла, пякла… / Усё прайшло, сплыло вадою, – / Маладосць не знікла, не прайшла!..*; *Хай чарада гадзін панурых, нудных шэрых, / Як попел, на душу мне клалася ўвесь час,/ Хаваючы сабой агонь гарачы веры, – Хай не відаць яго… / А ўсё ж ткі ён не згас!..*

Як вядома, пачуццёвая сфера ў любога чалавека не бывае аднастайнай, роўнай: услед за падзеямі, пэўным фактамі жыцця, на якія рэагуе псіхічны арганізм, змяняецца настрой і лад думак. Так і ў Багдановіча: як толькі хвароба часова адступала і памяншалася яе вастрыня, сімптомы, непрыкметна змяняўся экспрэсіўны арэол вечаровай і начной таямнічасці, стоенасці – станам, пра які А. Ахматава пісала: «И стих уже звучит задорен, нежен, / На радость вам и мне…»; паэтычныя фразы атрымлівалі рытмічны рух, энергію, станавіліся водгукам на грамадска-палітычнае жыццё, выражэннем веры, заклікам да змен, сягалі вышыні прароцтва. У такія часіны Максім Багдановіч выяўляў сябе «паэтам усеабдымнага ахопу жыцця» [6, с. 9], якому ўдавалася ў адным вершы гарманізаваць прыроду, сэнс жыцця і найшчырэйшую сваю мару ўбачыць Беларусь вольнай*: Беларусь, твой народ дачакаецца / Залацістага, яснага дня. / Паглядзі, як усход разгараецца, / Колькі ў хмарках залётных агня…; Але мне сэрца пяе: не нудзіся! / Прыйдзе вясна! / Гукне: «Прачніся, зямля! Прабудзіся/ З цяжкага сна!; Не згасла сонца! Сонца гляне, / Усіх падыме ада сна. / Ён, гэты дзень, яшчэ настане, – / І ачуняе старана!; Ты не зганеш, ясная зараначка, – Ты яшчэ асвеціш родны край. / Беларусь мая! Краіна-бранaчка!/ Устань, свабодны шлях сабе шукай; Праўда, ўсё прыціхла… / Бор замоўк і хвалі, / Але будзе бура, / Тым мацней удар!*

У вершах Багдановічавага «Вянка», калі аўтарам раскрываецца яго яднанне з прыродай, заўважаецца таксама культ ці інстынкт *цішыні*: прадуктыўна ўжываецца парыметнік *ціхі* і вытворныя ад яго словы *(Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы…*; *Сонца ціха скацілася з горкі…*; *Над вадой ля берага ціха спіць асока*; *Ціхі, ясны гімн вясне…*; *Ціхія мае ўсе песні…*; *Вечар ціхі, вечар просты*; *Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…*; *Ціша вее нада мною…*; *Цішыня агартае мне душу…*; *Ціха срэбрам грукае крыніца…*; *Ціхім каханнем к табе разгарацца / З гэтай пары я пачаў…*; *Тут ціша, тут спакой – ні шуму, ні клапот*; *Паветра напоена ціха гусцеючым змрокам…*; *Я*

*хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы / У ціхую сінюю ноч…*; *Усё ў пылу. І стала мне / Так сумна, сумна ў цішыне…*; *Выйшаў з хаты. Ціха спіць надворак*; *Ціхі і сіні блішча над хатай / Неба прастор*. / *Ціха гайдае ліпа над хатай / Лісцяў узор…)*.

Гэтую асаблівасць Багдановічавага паэтычнага пісьма, верагодна, трэба тлумачыць індывідуальна-псіхалагічнымі асаблівасцямі аўтара, яго чалавечай асобасцю, натурай інтраверта і натуральнай цягай да таго, каб сцішыцца, засяродзіцца на думцы ці вобразе або сродку іх выражэння, унутрана сабрацца, а гэтаму найлепш адпавядалі цішыня, стоенасць, спакой у прыродзе. Па ўспамінах тых, хто знаўся з таленавітым маладым беларусам, гаварыў ён звычайна ціха і мала, а калі глядзеў на субяседніка, то здавалася, што не бачыў яго, такі меў глыбокі ўнутраны пагляд [6, с. 9].

Багдановічава майстэрства фіксаваць найтанчэйшыя праявы прыроды і чалавека ў прыродзе асабліва выяўляюцца у двух яго вершах, што даўно сталі хрэстаматыйнымі і дзесяцігоддзямі вывучаюцца некалькімі пакаленнямі беларусаў. Хоць коратка, але абазначым іх лінгвастылістычныя асаблівасці:

**Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,**

*Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,*
*Улажылі спаць мяне вы на зямлі.*
*Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,*
*Ў небе месяца праглянуў бледны рог,*
*Ў небе ціха зоркі расцвілі.*

*Знічка коціцца агністаю слязой,*
*Прашумела мякка скрыдламі сава:*
*Бачу я, з прыродай зліўшыся душой,*
*Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,*
*Чую ў цішы, як расце трава.*

Гэты верш М. Багдановіча – выразная ілюстрацыя паэтавага ўменне слухаць і бачыць наваколле, успрымаць часам ледзь улоўныя галасы і рухі прыроды, рэагаваць на іх пэўным пачуццём і далучаць да гэтых працэсаў чытача. Не адразу ў творы ўспрымаецца

незвычайны ракурс, з якога паэт любуецца вячэрнім наваколлем, – знізу, ад паверхні нагрэтай за дзень зямлі: пасля звароткаў *вечар, вецер, стог* думка развіваецца дзеяннем *улажылі спаць мяне вы на зямлі.* Адсюль, з зямлі, да якой лірык прынік перад сном і ў якога нічога з гукаў і фарбаў вечара не знікае бясследна, чутно нават *ў цішы, як расце трава.* Маленькі верш Багдановіча, такім чынам, становіцца лакацыяй акрэслення мастацкага прынцыпу *з прыродай зліўшыся душою*, які пазней будзе заўважаны літаратурнай крытыкай.

Назіранне за прыгажосцю летняга вечара (а гэта і ёсць тэма вершаванага тэксту) мае прадметна-канкрэтнае выражэнне дзякуючы назоўнікам: *вечар, вецер, стог, зямля, пыл, дарогі, месяц, неба, зоркі, знічка, сава, трава*. Кожную з пералічаных з'яў ці прадметаў мы ўслед за паэтам згадваем як тое, што ўспрымаем у жыцці органамі пачуццяў.

Звернемся да назвы верша і да першага радка і іх гукавой інструментоўкі, алітэрацыі: *ц – п – ч – ц – х – ц – ж – х*. Пералічаныя гукі і іх літарнае абазначэнне нагадвае сцішаныя бліжэй да ночы праявы жывога і нежывога: заціханне дзённага ветру, шапаценне травы, цырканне цыкад. Душа ў такія хвіліны нібы зліваецца з прыродай, і ці не гэтую асноўную думку і заяўляе ў вершы М. Багдановіч. Эўфонія (мілагучнасць, створаная алітэрацыяй і асанансам) у малаформным тэксце дазваляе ў каторы раз адчуць прыгажосць, мяккае гучанне нашай мовы.

Паэтычнае адухаўленне з'яў прыроды ў зорную ноч, захапленне наваколлем стваральнік тэксту выразіў некалькімі метафарамі: *рог месяца праглянуў; зоркі дрыжаць ад ветру; зоркі расцвілі.* Матывavанасць пераносу дзеяння, яго характару з прадмета на прадмет асабліва выяўляецца ў метафарызаваным сказе *Знічка коціцца агністаю слязой*: кожны, хто бачыў, як падае і знікае зорка, відаць, пацвердзіць, што нейкае імгненне за ёй на небасхіле цягнецца, нібы слязінка, якую змахваюць, залацісты шлейф.

Варты выдзялення пра аналізе тэксту верша і азначэнне *светлы* (пыл), паколькі таксама паказвае назіральнасць паэта: пыл – найдрабнейшыя, сухія ад перагрэву глебы часцінкі цвёрдых рэчываў – сапраўды рэдка калі бывае цёмным і звычайна сцелецца ўздоўж дарог, з якіх падняты.

Атмасферу сцішанасці прыроды вячэрняй парой і пэўнай таямнічасці, якую нясе ноч, падкрэслівае частка складанага сказа

*Прашумела мякка скрыдламі сава* з дзейнікам *сава*: гэтая птушка, як вядома, палюе і наводзіць страх на грызуноў толькі ноччу. Словаформу *скрыдламі* (крыламі), а яна частая ў вершах паэта, на нашу думку, трэба разглядаць у кантэксце як магчымую па граматычных нормах беларускай мовы, якімі карысталіся ў 1910 годзе, калі пісаўся верш.

Паэтычны талент М. Багдановіча, яго валоданне літаратурнай мовай у поўнай меры, шчодра раскрыліся ў гэтым прыродаапісальным творы. Маюць рацыю тыя філолагі, хто ў якасці музычнай ілюстрацыі да верша выкарыстоўвае сусветна вядомую санату Бетховена пра ўзыходжанне месяца: гэта толькі дадае глыбіні пачуцця кожнаму, хто асэнсоўвае маляўнічасць, пластычнасць вобразаў у тэксце нашага класіка і ў самой прыродзе.

**Па-над белым пухам вішняў…**

*Па-над белым пухам вішняў,*
*Быццам сіні аганёк,*
*Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі*
*Сінякрылы матылёк.*

*Навакол усё паветра*
*Ў струнах сонца залатых, –*
*Ён дрыжачымі крыламі*
*Звоніць ледзьве чутна ў іх.*

*І ліецца хваляй песня, –*
*Ціхі, ясны гімн вясне.*
*Ці не сэрца напявае,*
*Навявае яго мне?*

*Ці не вецер гэта звонкі*
*Ў тонкіх зёлках шапаціць?*
*Або мо сухі, высокі*
*Ля ракі чарот шуміць?*

*Не паняць таго ніколі,*
*Не разведаць, не спазнаць:*
*Не даюць мне думаць зыкі,*
*Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.*

*Песня рвецца і ліецца*
*На раздольны, вольны свет.*
*Але хто яе пачуе?*
*Можа, толькі сам паэт.*

У вершы М. Багдановіча, што з’яўляецца і папулярнай песняй, лёгка вызначаецца тэма – надыход і росквіт вясны: тут шмат слоў і словазлучэнняў, якія маюць ў сваім значэнні прамыя адносіны да гэтай пары года (*белы пух вішняў; звонкі вецер; тонкія зёлкі, паветра ў струнах сонца; ціхі, ясны гімн вясне*). Але не так проста вылучыць асноўную думку: яна сінтэзуецца, вынікае амаль з усіх сэнсавых частак тэксту. Багдановічава ідэя, на наш погляд, заключаецца ў наступным: можна бачыць, як наступае вясна, але мала каму ўдаецца заўважыць ў многіх гуках і фарбах тонкія яе праявы, пачуць сапраўдны гімн жаданай цёплай пары. Таму верш і завяршаецца вывадам: можа, гэта дадзена найперш паэту.

Цеснаму сэнсаваму адзінству спрыяе пераважная ў тэксце злучальная сувязь сказаў, але яшчэ і падвоенае ці патроенае ўжыванне, нарашчэнне асобных, часта аднародных, часцін мовы – градацыя: *б’ецца, ўецца* (матылёк); *напявае, навявае* (сэрца); *не паняць, не разведаць, не спазнаць* (таго); *ляцяць, дрыжаць, звіняць* (зыкі). Малюнак вясновай прыроды становіцца ад гэтага больш пластычным, спазнавальным.

Замалёўка надыходу вясны, «вовлечённость всей природы в симфонию красоты» [7, с. 79], гукавая атмасфера чаканай пары перададзена дзеясловамі *звоніць, шапаціць, ляцяць, дрыжаць, звіняць*: іх лексічнае значэнне нацэльвае чытача на ўспрыманне гукавых дзеянняў прыроды як прыемных, часам ледзь улоўных, тонкіх. Аднароднасць інфінітываў ў састаўной частцы складанага сказа, іх градацыя (*не паняць таго ніколі, не разведаць, не спазнаць)*, ды яшчэ і з адмоўем *не,* толькі ўзмацняе асноўную думку твора пра недаступнасць чалавеку многага ў таямніцы няўхільнага і непрыкметнага поступу прыроды вясной.

З чаго, з якіх гукаў нараджаецца *ціхі, ясны гімн вясне*? Сітуацыя адгадвання паэтам прыроднага сакрэту перадаецца паслядоўным ужываннем пытальных сказаў: *Ці не вецер гэта… шапаціць?; Мо… чарот шуміць?; Ці не сэрца напявае, навявае яго мне?* Падкрэслім:

пытальныя сказы – адзін з паказчыкаў разважання як тыпу маўлення, якое перамежавана ў тэксце верша з апавяданнем і апісаннем.

Нюансы захаплення жыццём прыроды вясной выражаюцца то каларытнымі мастацкімі азначэннямі (*белы* пух вішняў; *сіні* аганёк; *сінякрылы* матылёк; струны сонца *залатыя*); то метафарамі (*струны сонца*; *звоніць крыламі*; *песня ліецца*; *сэрца напявае*; *пух вішняў*), то параўнаннем (матылёк, *быццам сіні аганёк*). У гэтай сістэме вобразных сродкаў лірыку індывідуальнага перажывання добра перадаюць якасныя прыметнікі ў словазлучэннях *ціхі, ясны* гімн; *тонкія* зёлкі; *сухі, высокі* чарот.

Такое ўмелае, як у гэтым вершы, выкарыстанне рэсурсаў роднай мовы дазволіла Багдановічу за кароткае жыццё выказаць шмат высакародных пачуццяў, зразумелых нам і сёння [8].

У апавяданні «Апокрыф» (як вядома, Максім Багдановіч сцвердзіўся і як празаік, перакладчык, літаратурны крытык) – гісторыі таго, як праз тысячы гадоў Хрыстос ізноў сышоў на зямлю і хадзіў па ёй, нікім не пазнаны, – аўтар уклаў у вусны Госпада думку, якую можна лічыць духоўным запаветам паэта: добра быць коласам, але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком, бо нашто каласы, калі няма побач гэтых кветак. Як відаць, і тут Багдановіч паслядоўны ў разгортванні матыву ўсеадзінства ўсяго зямнога і сябе як часткі гэтага ўсеадзінства. Нават у развітальным, з Ялты, чатырохрадкоўі – мініяцюрны накід прыроды побач з уцехаю, што пакідае люду беларускаму і сусветнаму свой зборнік:

*У краіне светлай, дзе я ўміраю,*
*У белым доме ля сіняй бухты,*
*Я не самотны, я кнігу маю*
*З друкарні пана Марціна Кухты.*

Максім Багдановіч, услед за многімі творцамі паэтычных карцін роднай прыроды, зрабіў шмат, каб, чытаючы сёння яго вершы, мы, як калісьці Ф. І. Цютчаў, пранікаліся адчуваннем, што ў землях, водах, нябёсах адгукаецца наша душа, што ў прыроды – свая свабода, свая мова стасункаў з намі.

**Список использованной литературы:**

1. Биографический словарь профессоров и преподавателей имп. Московского университета, ч. II. – М., 1985.

2. Конан, Ул. Святло паэзіі і цені жыцця: лірыка Максіма Багдановіча / Ул. Конан – Мн. : Маст. літаратура, 1991. – 208 с.

3. Тархов, А. Творческий путь Тютчева / А. Тархов // Ф. И. Тютчев. Стихотворения. – М. : Художественная литература. – 1972. – 303 с.

4. Кузина, Л. О жизни и творчестве Ф.И. Тютчева / Л. Н. Кузина, К. В. Пигарев // Ф. И. Тютчев. Стихотворения. Письма. – М. : «Правда», 1986. – 544 с.

5. Лойка, А. Лірыка Максіма Багдановіча / А. Лойка // Максім Багдановіч. Маладзік. Лірыка. – Выд-ва «Беларусь». – Мінск, 1968. – 290 с.

6. Заяц, Л. Максім Багдановіч / Л. Заяц // Шлях паэта: зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багданновіча. – Мн. : 1975.

7. Писарук, Г. В. Лингвистический анализ текста в вузе и школе / Г. В. Писарук, Т. М. Лянцевич. – Брест : БрГУ имени А. С. Пушкина, 2021. – 146 с.

8. Жигалова, М. П. Этновитальность и мультикультурность в судьбе и творчестве Максима Богдановича / М. П. Жигалова // Мастацкі свет Максіма Багдановіча: адметнасць, шматграннасць, універсальнасць : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. Старычонак В. Д. [і інш.]; адк. рэд. Старычонак В. Д. – Минск : БГПУ, 2012. – С. 99–109.